# РАЗДЕЛ I. О БРЕСТЧИНЕ И БРЕСТЧАНАХ

УДК 761/769.1 (476.7)
ББК 81411.3

## ПРАБЛЕМЫ РЭКАНСТРУКЦЫІ ГОРАДАБУДАЎНІЧАГА АНСАМБЛЯ БЕРАСЦЯ XVI СТ. У СВЕЦЕ МОЎНЫХ І МЕТРАЛАГІЧНЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ РЭЕСТРУ 1566 г.

**А.У. Варабей** – архітэктар,
кіраўнік мясцовага дабрачыннага
фонду «Фартыфікацыя Брэста»,
сябра Брэсцскага абласнога
аддзялення БДТАПГІК
**А.У.Жаркоў** – намеснік старшыні
камітэта па архітэктуры і будаўніутву
Брэсцкага аблвыканкама, начальнік
кіравання архітэктуры і
тэрытарыяльнага развіцця,
(Беларусь, Брэст)

**Анатацыя**

Рэвізія Берасцейскага староства – дакумент, які дазваляе зрабіць гіпатэтычную рэканструкцыю планіровачнай структуры Берасця сярэдзіны XVI ст., выявіць і лакалізаваць значныя гарадскія ансамблі. Праца з рэвізіяй патрабуе вузка-спецыяльных ведаў тэрміналогіі, моўных і метралагічных асаблівасцей дакумента.

У артыкуле робіцца спроба вызначыць асноўную адзінку вымярэння плошчы – сядзібнага прута. Гэта дазваляе зрабіць раскладку сядзіб, рынкавай плошчы і гарадскіх ансамблей у цэнтральнай частцы месца. Звяртаецца ўвага на неабходнасць дакладнага перакладу тэкста рэвізіі з улікам прафесійнай тэрміналогіі. Зроблены пераклад часткі рэестра берасцейскага замка.

**Ключавыя словы**

Берасце, рэвізія Берасцейскага староства, рэканструкцыя, рэестр берасцейскага замка, сядзібны прут, прафесійная тэрміналогія

Стаўшы каралём, Жыгімонт II Аўгуст прыходзіць да высновы неабходнасці рэвізіі каралеўскіх маёнткаў. Мэта рэвізіі была агучана ім у звароце да землеўласнікаў Валыні – спыніць злоўжыванні феадалаў і пасадоўцаў «на месцах» [12, с. 327]. Праз сем гадоў праводзіцца вялікая і сур’ёзная праца – рэвізія ўсіх каралеўскіх маёнткаў у Літве і на Валыні. Рэвізія пачынаецца з Валыні у 1552 г. і завяршаецца у 1566 г. у Берасці [12, с. 328].

Правядзенне рэвізіі відавочна звязана з прынятай у 1557 г. «Уставай на валокі» – зямельнай рэформай. Рэформа, сярод іншага, прадугледжвала ўлік зямлі і адпаведную плату ў залежнасці ад памераў, месцазнаходжання сядзібы, якасці зямлі і т.п. Такім чынам, узнік шэраг рэестраў, у тым ліку апісанне Берасцейскага староства.

Вопіс староства пачынаўся з галоўнага горада. У першую чаргу вымяраўся рынак. Потым рэвізоры ішлі па вуліцах, вядучых ад рынку да гарадскіх сцен, і дакладна мералі плошчы сядзіб і агародаў, спачатку з правага боку вуліц, потым, вярнуўшыся да рынку, з левага боку. Дакладна запісвалася юрыдыка і прозвішча гаспадара зямлі, плошча сядзібы, агарода. Скончыўшы з галоўнымі вуліцамі, пераходзілі да вуліц, перасякаўшых галоўныя, і да перыферыйных вуліц у прадмесцях. Потым вымяраліся агароды і сенажаці за горадам. Па кожнай вуліцы і па частках месца падсумоўваліся плошчы і сума грошай для выплаты ў казну, распісваліся павіннасці і абавязкі насельніцтва. Такім жа чынам паступова праводзіўся вопіс мястэчак, фальваркаў, вёсак, млыноў, карчмоў ва ўсім старостве [12, с. 329]. Рэвізія Берасцейскага староства завяршаецца рэвізіяй Берасцейскага замка.

Гэты каштоўнейшы дакумант даследваны і апублікаваны М.Н. Доўнар-Запольскім [17]. Літоўскія рэвізіі і люстрацыі XVI ст. адрозніваюцца ад рэвізій пазнейшага часу і нават ад сучасных ім рэвізій польскіх зямель. Па-першае, рэвізоры старанна выконвалі свае абавязкі, не баяліся мясцовых каралеўскіх чыноўнікаў і магнатаў. Па-другое, на якасць іх працы ўплываў «грамадскі кантроль» – мясцовыя ўлады і жыхары ўважліва сачылі за дзеяннямі рэвізораў, і яны вымушаны былі працаваць сумленна [12, с. 329-330]. На пост-рэформавыя рэвізіі XVI ст. можна смела абапірацца як на крыніцу даследвання і рэканструкцыі гарадской структуры.

Для аднаўлення планіроўкі не дастаткова вопіса, павінен быць план месца ці дадзеныя археалогіі. Распрацаваны методыкі даследавання аднаўлення гістарычнай планіроўкі па больш позніх планах [3, с.13]. Параўнальны аналіз берасцейскіх планаў XVII-XIX стст. паказвае нязменнасць гарадской планіровачнай структуры (мал.1). Аснова планіроўкі – сетка вуліц і зямельны надзел, нерухомасць якога была асвечана рэлігіяй [5, с.9]. У якасці апорнага плана карыстаемся планам 1823г., як найбольш дакладным, карэктуючы сітуацыю па планах Дальберга і Фюрстэнхофа [*]. Прывязку планаў да сучаснай геападасновы ажыццяўляем у праграме AutoCad. У якасці апорных кропак выкарыстоўваем рэшткі збудаванняў старога горада – руіны кляштара бернардзінак, падмуркі калегіюма езуітаў і базыльянскай царквы.

Вялікае значэнне маюць адзінкі вымярэння, якімі карысталіся ў даследуемыя часы. Пры абмерах сядзіб у вопісе выкарыстаны пруты. Велічыня літоўскага прута 4,87 м. Квадратны прут падаецца 23,72 м$^2$ [21, с.577]. Доктар урбаністыкі І.Б. Лаўроўская пры рэканструкцыі планіроўкі цэнтральнай часткі месца карысталася менавіта лінейнай велічынёй прута, выкарыстоўваючы памеры з рэвізіі ў якасці даўжыні сядзіб па фронце вуліцы ці рынкавай плошчы [2, с.1228].

Такая трактоўка выклікае сумнеў, паколькі рэвізоры, як было ўзгадана вышэй, вымералі не даўжыню, а плошчу сядзіб, каб вылічыць памер грашовага падатка. Карыстаючыся «тыповым» прутом квадратным у 23,72 м$^2$, трапляем у метадалагічны тупік. Найменшыя сядзібы маюць плошчу ¼ прута = 5,93 м$^2$.

Плошчы пад культавымі збудаваннямі вельмі малыя, напрыклад двор рускага біскупа з царквой св. Міколы займае 15,25 прута = 361,73 м$^2$. Шпіталь месцкі пры царкве – ¾ прута = 17,79 м$^2$. Пры тым, што плошча забудовы Мікалаеўскай царквы з больш-менш дакладных планаў XVIII – XIX стст. каля 880 м$^2$. Нават з улікам перабудовы і магчымага павялічэння храма атрымоўваюцца несумяшчальныя велічыні. Плошча замка – 90 прутоў*23,72 = 2134,8 м$^2$ пры тым, што рэальна тэрыторыя замчышча – каля 2 га.

Наратыўная крыніца прыводзіць яшчэ адно вымярэнне – pręt większy kwadratowy, роўны 1,995 а. ці 199,5 м2 [20]. Паводле М. Доўнара-Запольскага пазамельныя меры, выкарыстаныя ў вопісе, наступныя: «из десяти шнуров составлялся один прут, из 30 прутов – один морг» [17, с. 2]. Моргам (ад ням. Morgen – ранак) называлася зямельная плошча, якую сялянін мог апрацаваць з ранку да палудня. У ВКЛ морг быў роўны 0,7123 га [21, с. 221 – 222]. Такім чынам, велічыня рэвізійнага прута атрымоўваецца 237 м$^2$. Тады велічыня сярэдняй сядзібы 1-2 прута атрымоўваецца ад 230 да 470 м$^2$. У XVI ст. дзялка ў польскіх гарадах, напрыклад, была ад 370 да амаль 900 м$^2$ [4, с. 94, 95].

Рэвізія 1566 г. вылучае наступныя часткі горада: *место в паркане*, *место за паркапомъ*, *место за малой Угринкой*, *место за Мухавцомъ* і замак. У артыкуле, прысвечаным аналізу і рэканструкцыі гарадской планіроўкі XVI ст. І.Б. Лаўроўская вылучае *место в паркане* як частку тэрыторыі цэнтральнай выспы Брэсцкай крэпасці, якая знаходзілася вакол рынкавай плошчы і мела геаметрычна правільную рэнесансную форму [2, с. 1228]. Абгрунтоўваецца гэта тым, што парканам, агароджай, было абмежавана новалакаванае месца, дзе пражывалі каталікі (палякі з немцамі) на праве нямецкім у адрозненні ад русінаў і новахрышчоных ліцвінаў, выведзеных з-пад Магдэбургскага права (МП) Вял. кн. Вітаўтам. МП, па меркаванню даследчыка, было выгодным найперш для жыдоўскай і нямецкай супольнасці Берасця. Адсюль з’явіўся выраз «месца ў паркане», які страціў значэнне пасля ўключэння русінаў у МП у 1496 г., а канчаткова паркан знік пасля пажару 1613 г. [2, с. 1227, 1228].

Гэта версія выглядае малаверагоднай з-за наступных фактаў:

– сярод бенефіцыяраў нямецкага права не было жыдоўскай супольнасці. Паводле Бершадскага: «евреи и магдебургия – вещи несовместимые» [12, с. 181]. У прывілеях Берасцю на МП узгадваюцца толькі хрысціяне – тэўтоны, палякі, літвіны, русіны [11, с. 45];

– прывілей на МП Берасцю ад Вял. кн. Казіміра 1440 г. пераводзіць у права нямецкае жыхароў «polonus, ruthenos, lithuanos, theutonos». Пры гэтым важліва, што «тэўтоны» у пераліку стаяць на апошнім месцы. Такім чынам, паляпшэнні і даброты ад МП у першую чаргу накіраваны на палякаў і русінаў. Па меркаванню Е. Бардаха, рэцэпцыя нямецкага (ці хелмінскага) права ў ВКЛ адбывалася, за рэдкім выключэннем, без нямецкага этнічнага элемента [1, с.45];

– у канцэпцыю паркана-сцяны, абмяжоўваючай каталікоў палякаў і тэўтонаў ад іншых этна-канфесійных груп не ўпісваецца размяшчэнне кляштара

аўгусцінаў і нямецкай, па меркаванню І.Б. Лаўроўскай, калоніі [2, с. 1228] на Заўгрынецкай выспе, тобок па-за лакацыйным «месцам у паркане»;

– недастаткова даследвана, наколькі прывілеі Берасцю на МП паўплывалі на прасторавую перабудову горада, як гэта рабілася у Польшчы з улікам нямецкай каланізацыі [4, с. 93]. Берасцейская магдэбургія – не заснаванне новага паселішча на нямецкім праве і не наданне гарадскіх вольнасцей сельскаму паселішчу. Галоўнай мэтай, згодна тэксту прывілеяў было паляпшэнне становішча жыхароў (і адпаведна павелічэнне даходаў у казну).

Неабходна заўважыць, што нават войт меў юрыдыку за межамі «месца ў паркане» (Войтава прадмесце па вул. Войтаўскай захавалася да зносу горада і адмечана на планах XIX ст.). Пры гэтым, структура плана не выяўляе прамавугольных кварталаў, характэрных для «нямецкай мадэлі» горада. Геаметрыя Берасця вызначана напрамкам шляхоў – гасцінцаў. Адзіны «магдэбургскі» акцэнт – рынкавая плошча, блізкая да прамавугольніка, і забудова вакол яе. Пры тым, што плошча не паглыблена ў забудову, як гэта было у сярэднявечных гарадах Еўропы, а адным бокам раскрываецца на замак, што больш характэрна для гарадоў Русі ці еўрапейскай рэнесанснай планіроўкі [20, с. 56 – 57];

– у крыніцах паркан узгадваецца выключна як абарончае збудаванне – гарадская сцяна [8, с. 20; 10, с. 199-200]. Усе мяшчане, незалежна ад юрыдык, мелі ў паркане свае часткі для абароны і павінны былі іх аднаўляць пасля пажару і забяспечваць порахам і агнястрэльнай зброяй [10, с. 199-200]. Працяг гарадскіх умацаванняў вызначаны ў заяве вознага аб аглядзе гарадскога валу: «*зъ реки Мухавца, отъ копищъ жидовскихъ, болоньемъ ажъ в реку Бугъ упадаючый*» [8, с.20]. Такім чынам, *место в паркане* – тэрыторыя сучаснага цэнтральнага вострава Брэсцкай крэпасці. Абмежавана і абвалавана яно было, хутчэй за ўсё, у канцы XIV ст., пасля першай берасцейскай магдэбургіі. Згодна з традыцыяй, вызначэнне тэрыторыі і абмежаванне як мінімум ровам рабілася адразу пасля надання гораду прывілеі на МП [4, с. 93].

Рэвізія «месца ў паркане» пачынаецца з пераліку чатырох бакоў (*полатей*) рынкавай плошчы. Рэвізоры абыходзілі рынак па перыметру з першага па чацвёрты бакі. На чацвёртым баку месціўся замак і саляны *шпихлер* [19, с. 206]. Уласна замак месціўся на выспе паміж Бугам і Мухаўцом. Гуртавы саляны склад фахверкавай канструкцыі (*в дерево мурованый*) стаяў на палях над Мухаўцом каля замкавага маста. Побач знаходзіліся чатыры бровары і ятка для біцця быдла [19, с. 444]. Лагічна дапусціць, што другі бок плошчы месціўся насупраць чацвёртага. Гэты бок вызначаецца аднолькавай плошчай сядзіб – тыповая рэгулярная «нямецкая» традыцыя. Калі дапусціць, што лік ішоў ад замку (замкавага маста), то *первая полать* – усходняя (адлік па вуліцах ішоў спачатку па правым баку, потым па левым), трэцяя – заходняя частка рынка. Глыбіня сядзіб прымаецца згодна плану 1823 г. – ад 36 да 42 м. (да 72 лакцей). Пры выкарыстанні прута ў 237 м., плошчы сядзіб згодна прапанованай раскладцы «палацей» дакладна ўпісваюцца у межы рынка на геападаснове (мал.2).

Пойдзем з рэвізорамі ад рынку па вуліцах Берасця. У межах *места в паркане* ў вопісе ўзгаданы вуліцы *Ковалская гостинцемъ Виленским*, *Жидовская*, *Пески гостинцомъ Краковскимъ*, і вуліца *в тиле той полати надъ Бугомъ* – вуліца з тылу левага боку забудовы вул. Пескі [19, с.205-209]. Тапаніміка першай паловы XIX ст. захавала толькі вуліцу Пясечную – сярэднявечную вул. Пескі, якая вяла ад рынку да Міхайлаўскай царквы на прадмесці Пескі і далей, міма Пятніцкай царквы, на месцы якой у XVII ст. паўстаў кляштар брыгітак [19, с. 217]. Вуліца Жыдоўская – месца кампактнага пражывання кагала – вызначаецца па размяшчэнню сінагогі. У 1823 г. яна называлася Доўгая. Вуліца Кавальская пачыналася ад рынка і вяла да гасцінца Віленскага. Пад 1613 г. пазначана, што яна даходзіла да Віленскай брамы [9, с. 196]. На плане 1823 г. гэта вуліцы Валынская і Базыльянская.

Вулачка «у тыле той палаці над Бугам» праходзіла прыкладна там, дзе ў 1823 г. пазначана вул. Падзамкавая. Яна ж узгадваецца ў больш позніх дакументах як Надбужная [6, с. 61]. Асобна апісаны *кутъ коло костела у фари и церквы морованой Микулинской* – кут (тэрыторыя) каля фарнага (парафіяльнага) касцёла і мураванай Мікалаеўскай царквы, якія размяшчаліся ў паўднёва-ўсходняй частцы «месца ў паркане». Цяжка сказаць, чаму рэвізоры не прывязалі сядзібы, царкву, касцёл да вуліц, а запісалі ўсё адным кутом, раздзяліўшы па юрыдыках. На плане 1823 г. фарны касцёл, пазначаны як недабудаваны, «перамясціўся» на рынкавую плошчу, на месцы касцёла XV – XVII стст. пазначана капліца і могілкі. Размяшчэнне старога касцёла традыцыйна адасоблена ад рынку, ён з'яўляўся дамінантай асобнай прыкасцёльнай плошчы. Відавочна, што стары Вітаўтаў касцёл быў разбураны падчас войн і паўстанняў сярэдзіны XVII ст.

Такім чынам, атрымоўваецца гіпатэтычная схема рэканструкцыі планіроўкі месца ў паркане (мал. 2). Цікава, што відавочны розныя памеры паўднёва-заходняй часткі месца на планах XVII, XVIII, XIX ст.ст. і сучаснай падаснове. На плане XVII ст. (мал. 1) бачны два равеліна за межамі горада, якія ўзмацнялі абарону Берасця з поўначы, з боку Віленскага і Церабуньскага гасцінцаў. У XVIII ст. недагледжаныя ўмацаванні былі спачатку забудаваныя дамамі, а пры будаўніцтве Цытадэлі роў прайшоў паўночней былых равелінаў, змяніўшы габарыты выспы. З планаў бачна, што русла рэк мянялі свой напрамак з цягам часу. У XVII ст. Заходні Буг рэзка выгінаўся на захад ад месца ў паркане. Яго заходні бераг быў плыткі, са мноствам старыц, затокаў і таму амаль не забудаваны.

*Место за паркономъ* і *место за малой Угринкой* – перыферыйныя часткі месца, па-сутнасці прадмесці. Гэта тэрыторыя пастумова засяляецца як мінімум з канца XIV ст., калі ўздоўж дарогі, вядучай на паўночны ўсход ад горада з'явілася юрыдыка берасцейскага войта. Пазней, на Заўгрынецкім востраве, аўгусціны атрымалі палац Біруты (на месцы старога гарадзішча) [13] і пабудавалі кляштар. У 1505 г. да Троіцкага клаштара быў перанесены шпіталь св. Духа. [12 с. 342] У вопісе гэта *шпиталъ с костеломъ* на вуліцы Угрынка, маючы сядзібу ў 20 прутаў і такі ж агарод [19, с. 209].

Характэрнай рысай мясцовай перыферыі была вялікая колькасць свецкіх і духоўных юрыдык (людзі шпітальныя, уладычныя, касцёла св. Барбары etc) – тэрыторый, што знаходзіліся пад прыватнай свецкай ці царкоўнай юрысдыкцыяй па-за магдэбургіяй. Галоўныя элементы юрыдык – саслоўная абасобленасць, уласная адміністрацыя, падатковая аўтаномнасць. Падобная сітуацыя падрывала пазіцыі магістрата і парушала суцэльнасць гарадской абшчыны [16, с. 19 – 21].

Наогул мясцовай прастора XVI ст. выглядае цалкам неаднароднай. Неабходна ўлічваць наяўнасць у горадзе двух «паралельных» урадаў – «бурмістра руськага» і «бурмістра ляцкага» [7, с.46-48], якім, адпаведна, падпарадкоўваліся мяшчане «веры руськай» і «веры ляцкай» (усходняга і заходняга хрысціянскіх абрадаў). Пад юрысдыкцыяй старасты (замка) па-за МП знаходзіўся берасцейскі кагал. «Правы і абавязкі» жыхароў рознай юрысдыкцыі пералічаны ў рэвізіі [19 с. 230 – 232]

*Место за Мухавцомъ* [19, с. 223 – 228] ці Замухавечча знаходзілася на паўднёвым беразе Мухаўца і прылягала да замку. Праз яго прахадзіў гістарычны шлях на Валынь. Тэрыторыя размежавана канфесійна – у паўночна-ўсходняй частцы пражывалі каталікі (людзі біскупа), уздоўж гасцінца Луцкага, каля манастыроў сяліліся русіны.

Рэестр замка завяршае вопіс [19, с. 442 – 447]. Нажаль, фармат артыкула не дазваляе засяродзіць увагу на падрабязным вопісе замкавых пабудоў. Тэма Берасцейскага замка неаднаразова разглядалася ў навуковай і краязнаўчай літаратуры [14, 18]. Але да гэтага часу не быў апублікаваны пераклад вопіса замка на сучасную мову. Праца з фрагментамі, вырванымі з кантэкста, часам прыводзіць да спрэчных высноў. Так сховішча, выкладзенае тарціцамі [19, с. 443] (*тартица* – брус, выраблены на тартаку) пераўтвараецца ў склад шчытоў-тарчэй [18, с. 119-120]. *Кганокъ* разглядаецца выключна як ганак – уваход [18, с. 106] пры тым, што ганак мае значэнне балкона ці вежы, асабліва калі ён «верхні». *Куна железная* трактуецца як ланцуг [18, с.132], на самой справе куна ў варотах – кальцо для ганебнага пакарання [14, с.27]. Піўніца, змураваная са старой абваліўшайся вежы [19, с.443], ператвараецца ў абваліўшуюся і адрамантаваную вежу Уладзіміра Васількавіча [18, с.126-127] і т.п. У дадатку 1 прапануецца пераклад часткі рэестра Берасцейскага замка, зробдены з выкарыстаннем «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» пад рэд. А. Булыкі, з удакладненнем тэрміналогіі паводле прац З. Глогера.

Падсумоўваючы вышэй узгаданае, прапануецца рэканструкцыя планіроўкі Берасця сяр. XVI ст. з удакладненнем месцазнаходжання гарадскіх ансамбляў, часткова рэканструяванай схемай сядзіб на тэрыторыі месца ў паркане і паказам юрыдык, якія існавалі у гарадской структуры па-за межамі МП (мал. 2, 3).

* Заўвага. План 1657 г. «Grundtrik der Stadt undt Festung Littauwsch Briestie…» апублікаваны А. Катлярчуком у манаграфіі «In the shadows of Poland and Russia», захоўваецца ў Нацыянальнай Бібліятэцы Швецыі, у альбоме “Grand recueil de desseins. Tom: IV” пад нумарам 10782. *Plan von der Stadt Brzesc in Littauen,* са збору Яна Георга Максімільяна фон Фюрстенхоффа, упершыню апублікаваны А. Белым, у артыкуле «Невядомыя эпізоды «невядомай вайны» Спадчына. –1999. – №3. – С. 114 – 129. *План города Бреста Литовскаго и местечка Тересполя. Снят…. 1823 г,*

**Дадатак 1.**

Рэестр замку Берасцейскага рэчаў, да гаспадарства належачых.

Будаванне замкавае: гмахі новыя зверху: дзве святліцы. У адной ізбе злева ад усходу сонца шесць шкляных шыбак. З той святліцы камора; з каморы над Мухаўцам і Бугам стары балкон (ганак); у другой ізбе шэсць шыбак; у тых гмахах замкоў унутраных пяць; за тым гмахам камор дзевяць, ідучы да вежы над старой брамай, у каторых на скобах чатыры ланцугі. Гмахі старыя: За вежай ізба, у ёй четыры шыбы, печ, лавы; сені, у іх дзве шыбкі, два мураваныя коміны, у дзвярэй унутраны замок, с тых жа сяней другая святліца, у ёй четыры шыбкі, печ добрая, бакавое памяшканне, у якім стол малы са скрынкаю, лаўка; у той ізбе замест лаў, скрынь зялёна паліваных адзінаццаць з замкамі і ручкамі пабеленымі. За той ізбой камора, у ёй дзве шыбкі, комін, вешалка і скрынь зялёных тры, ліштвы і пафарбавана вакол, у дзвох дзвярэй два замкі; з той каморы другая камора, у ёй дзве шыбкі, комін, у дзвярэй замок нутраны, з тых абодзьвух каморак патрэбныя каморкі; з той каморы сень вялікая, у ёй тры шыбы, лавы, замок унутраны з блямкаю; з сяней вялікая святліца, у ёй тры шыбы, печ і лавы. З той вежы пад вежаю з гадзінікам ёсць камора, у ёй тры шыбы нямалыя, у дзвярэй унутраны замок з блямкаю, за той каморай на вежы тры каморкі, з іх у двух каморкі патрэбныя. За вежай гадзіннікавай старое будаванне: сенка малая – адна шыба, комін мураваны, лавы; святліца, у ёй дзве шыбы, печы, лавы, замок у дзвярэй, з той святліцы сенка другая, у ёй шыба, комін мураваны, лавы ў дзвярэй, замок с блямкаю, з сяней святлічка, дзве шыбкі, лавы, печ, у дзвюх дзвярэй замкі. За тымі гмахамі заля, у ёй шэсць шыб, лавы, у дзвярэй – сядзенні, ганак, з залі камор чатыры ў гароднях, з іх каморы патрэбныя. За тым будаваннем, мінаючы вежу трэцюю ад Мухаўца, і да другой вежы камор 18; у каморы, каторая на вежы, – ланцуг і ўсходы, у сцяне ёсць сенка і свяцёлачка, адна шыбка, печ, лавы, са свяцёлачкі камора, у ёй дзве шыбкі, з з сенкі камора, дзверы усе з зачэпкамі. Ад вежы, якая ад Замухавечча, да другое вежы каля гмахаў новых, ад Буга ёсць дзевятнаццаць камор, у дзвюх ланцугі і камора пад той вежаю з ланцугом. Вакол таго верхняга будавання есць агароджа (зубцы), на якое з долу трое ўсходаў, падбітых гонтам. Унізе ў сцяне няма будавання, падобнага верхняму, толькі камор звычайных (грамадскіх) з зашчапкамі і без зашчапак усяго 75, паміж якімі за малым замкам у правай руцэ абароны, у пяці камор дзверы з ланцугамі, а ў адной унутраны замок.

Цейхгауз – дом на падмурку, у якога на гары чатыры каморы паасобку, пры *путехъ*, у цэнтры прыстасаванні (*шракги)* для вешання і складання зброі і іншых рэчаў ваенных, дзве дзверы з замкамі, адны на бляшкаване, другія на ніз; перад замкам і ўсходы з абодвух бакоў ганка, перад дзвярмі ўнізе сховішча, вылажана брусам, вороты і дзве дзверы перад ганкам, шыбы шкляныя з крыжамі.

…Дом на падмурку за цэйхгаузам, доўгі, на рагу святліца, у ёй тры шкляныя шыбкі, лавы, печ; з ізбы: камора, дзве шыбкі у дрэва апраўленыя, з яе каморка патрэбная, сені, тры шкляныя шыбы, печ, лавы; трэцяя свяцёлачка, у ей адна шыба і печ, за ёй камора, дзве шыбы, комін мураваны, з той каморы сенка, збоку шыба ў дрэва уроблена адна, у ёй сходы на гару, на той дом і каморка патрэбная; чацвертая свяцёлачка – шыбы тры, печ, ліштвы дзве, сені другія, шыб шкляных тры, комінаў мураваных два; пятая святліца, большая за ўсіх, шыб шкляных пяць, печ, лавы; у тым доме ўсі ізбы цэглаю вылажаны, дзверы на завесах, у некаторых зашчэпкі, кручкі, ручкі. Кухні дзве. Перад кухнямі ганак з двюма ўсходкамі, у кухнях каморы для кухан-ных рэчаў, лавы ўкруг; першая ізба па правай руцэ, у ёй шыб чатыры, печ; з святліцы камора, адна шыба, комін ад печы і прыбіральня; другая святліца з прыходу злева – тры шыбы, печ простая, камора і прыбіральня, дзверы ўсі на завесах. Піўніц тры: першая пад новымі гмахамі, ад Буга, мураваная, у ёй свяцёлачка таксама мураваная, у ёй дзве шыбкі, печ, дзверы на завесах і сенка перад свяцёлачкай, ад той свяцёлачкі ўгору выведзены комін да новых гмахаў абодвух. Другая піўнічка пад сцяной замкавай у зямлі драўляная за вежаю гадзіннікавай. Трэцяя піўніца

вялікая мураваная за кухнямі з вежы старой абваленай, нанава адрамантавана, з паверхам драўляным, а зямлёю прыхавана, на слупу зверху гонтамі прыкрыта.

Веж замкавых пяць адноўленых: на адной гадзіннік ад месца, які заўжды б’е. Другая вежа ад Мухаўца на ўсход Сонца; трэцяя ад Замухавеча напалам да поўдня; чацвёртая ад Буга на поўдзень летні; пятая над брамаю старой з ганкам зверху, на якой зверху звон вялікі з *Волни* (Валыні) прывезены. У браме старой пашкоджанай пад вежаю дзве вязніцы для саджання вязняў, у адной, па левай руцэ ідучы, з замком краты з завесаю жалезнай, у другой пліта з завесам драўляным і зашчэпкі са скабой. Да таго замку брамы дзве за стараствам яго міласці пана Астафея Валовіча, падканцлера і маршалка дворнага Вялікага Княства Літоўскага, старасты берасцейскага і кобрынскага, нова ўроблены, адна ад рынку пад вежаю супраць стаен караля яго літасці; з тых абедзвюх брам масты два нова аздобленыя на звязі, на рынак адна з варотамі (з варот?), у якіх жалезнае кальцо, другі мост да стайняў, абодва вялікія; у старой браме фортка з каторай усходы і масток, гонтам падбітыя з апорай нановаробленай, да лазні замкавае. Лазня за Мухаўцом на палях з белаю печчу і з катлом і корак латунны для спушчэння вады, пад каменкаю жэсць і жалезныя краты на чатыры бакі, *верхница* (палок?) і лавы, шыбак шкляных дзве; з святліцы ганак над Мухаўцом і прыбіральня, дзверы ўсі на завесах. Стаен замкавых за Мухаўцом чатыры; абозня адна, у іх карыта, драбіны і *переворини*, што конюхі рамантуюць; каля тых стаен пляц, на каторым можа быць стайня добрая; там жа і свіран для захавання сена. Кузня там жа над Мухаўцом з комінам, але маёмасці кавальскай на ёй няма. Дом страмянога побач тых стаен, у каторым аб адной сені прасторнай дзве святліцы з каморкамі на завесах, печы і коміны верхія і пабітыя. Пякарня над Мухаўцом пры месцы, вельмі старая, з яе камора; супраць пякарні аб адной сені зруб ветхі.

Склад саляны вялікі ў моста замкавага на палях, у дрэва мураваны, аб якім Валтбах рабіў справаздачу, быццам гэта ён сваім уласным коштам будаваў. Там жа над Мухаўцом бровараў зрубленых агулам чатыры, якія за ўсякімі патрэбамі комінамі і жароўнямі, нанова адбудаваўшы, *жыдам* у арэнду аддадзены. Рыштунак тожа браварны ўсякі паводле патрэбаў ва ўсіх броварах ёсць, які за грошы замкавыя арэндаваныя праз жыдаў нова набыта і па заканчэнню арэнды такое ж аддаць павінны. За тымі броварамі над Мухаўцом ятка для патрэбы біцця быдла замкавага. Саладоўні дзве над Бугам ад месца каля перакопу, у іх *озницъ* мураваных тры са ўсімі патрэбамі, у адной саладоўні печ кафлявая.

Будаванне на востраве паміж Бугам за млынамі:

Дом новы для прачак – сені, у іх камора, вялікая святліца, печ простая, дзверы і аканніцы на завесах. Бровар замкавы новы, з двайной катлінай з комінамі, *передвоен,* у тым бровары рыштунку чатыры, кацёл адзін, жораў для цягнення вады над Бугам з жолабамі. Там жа домкаў сем, якія самі сабе пабудавалі тыя, што ў іх жывуць, на зямлі замкавай, а яшчэ нічога з таго не плацяць, толькі дапамагаюць рамантаваць грэблю і летам полюць замкавыя агароды. Рурмус (пампавальная станцыя), або млын, з якога вада па трубах да замку ідзе, аб адным коле ў адным вальным, вялікім, у якім помпы медныя, або *спижние* за штэмпелямі жалезнымі. Іншымі патрэбамі да таго належачымі, жалезам апраўленыя; там жа яшчэ можа быць сукнавальня, ці ступа для таўчэння пораху; той дом з вежыцаю, у дзвярэй замок унутраны, у ім свёрлаў вялікіх для свярлення трубаў два. Дом купецкай гільдыі на вуліцы Кракаўскай, у месцы каля саладовен, – сені, святліца вялікая, вакон вялікіх чатыры без шыбак, печ, з святліцы камора, супраць другая святліца – шыб шкляных тры, і таксама з яе камора на дварэ, ад вялікай святліцы кухня, комін просты, дзверы, аконныя рамы ўсі на завесах. Піўніца пасярод двара вялікая на двае падзеленая, дзверы на завесах, зверху над піўніцаю ганак на гаспадарства летняе гонтам аббітае, каля піўніцы ляднічка невялікая. З тылу над Бугам бровар і пры ім ізба чорная старая…

…Сажалкі замкавыя: Першая у канцы грэблі за млынам тартачным новая, другая паміж Мухаўцом і старым Бужышчам старая, недагледжаная;

Млыны на Бугу і Мухаўцы. За броварамі месцкімі грэбля вялікая цераз абедзве ракі Буг і Мухавец, на якой праток чатыры: У першым млыне – кол вадзяных чатыры, камянёў таксама чатыры з ўсімі прыладамі; млынніца вялікая новая глінаю палеплена і саломай узмоцнена, у ёй камор для сыпання збожжа чатыры, печ мураваная, комін мураваны, шыбы шкляныя, дзверы на завесах; там жа дамок млынарскі новы са свяцёлачкай. У другім млыне на той жа пратоцы – на адно вадзяное кола камянёў два з ўсімі прыладамі і млынніца над коламі воднымі прыкрыта, *або опар для обворовання от морозу*. У Прылуках на рацэ Буг – млын а дзвюх колах, з каторых млыноў дзве меркі на караля Я. літасць, а трэцяя млынару ісці мусіць. За пратокам млыноў месцкіх незапушчаным вялікім і рурмусам млын тартачны з ўсім неабходным і начыннем жалезным і драўляным, да таго належачым, піла моцная і вялікая ў плячах умацавана са *строками*, кола цугавае з жалезнымі зубцамі, вакол з *крацою* і з далатом, ключоў жалезных для пілы два, пільшчык адзін, скоб чатыры, тыя млыны коштам замкавым зноў будуюць і рамантуюць.

**Дадатак 2. Малюнкі.**




**Мал. 1**

1. План Э.Дальберга 1657 г., 2. План М.Г. Фюрстенхоффа 1 пал. XVIII ст., 3. План 1823 г.




**Мал. 2.**

1. Ратуша. 2. Соляной склад, бровары. 3. Фарный костёл. 4. Николаевская церковь. 5. Костёл со шпиталем. 6. Синагога. 7. Космо-десьянский плац. 8. Солодовни. 9. Михайловская церковь




**Мал. 3. Планіровачная схема горада сяр. XVI ст.**

**Літаратура**

1. Bardach J. Miasta па prawie magdeburskim w wielkim ksiestwie Litewskim od schylku X IV do polowy XVII stulecia // KH. – Warszawa, 1980. – № 1. – S. 45

2. Irena Ławrowska. ANALYSIS OF THE TERRITORIAL LAYOUT… p. 1228 https://pl.wikipedia.org/wiki/Systemy_miar_stosowane_na_ziemiach_polskich режим доступа 29.10.2017, 21.00

3. Kamil Nieścioruk: Metodyczne aspektykartograficznej analizy i oceny dawnych planów miast na przykładzie planu Lublina z 1716 roku C. d'Örkena.Lublin 2006. Электронная крыніца http://www.niescioruk.ppa.pl/pliki/analiza_ppk.pdf, доступ 09.11.2017, 14.00

4. Maria Bogucka, Henryk Samsonowicz. Dzieje miast i mieszczańtwa w Polsce przedrozbiorowej / Zakład Narodowy imienia Ossolińskich Wydawnictwo – 1986.

5. АВАК, Т. II

6. АВАК, Т. V

7. АВАК, Т. VI

8. АВАК, Т.XXVIII

9. АВАК, Т.XXXIII

10. Акты литовско-русскаго государства, изданные М.Н. Довнаръ-Запольским. Выпускъ 1. (1390 – 1529 г.) Москва – 1900 г.

11. Баравы, Р. Атрыманьне магдэбургскага права Берасьцем і палітычная барацьба ў Вялікім Княстве Літоўскім на мяжы XIV – XV ст., Беларускі гістарычны агляд. – Т. 1. – Сш. 1 – Лістапад, 1994. – С. 38-54.

12. Бершадскій, С.А. Литовскіе евреи. – С.Петербургъ, 1883 г.

13. Воробей, А.В. Генезис планировочной структуры средневекового Берестья / А.В. Воробей // Вестник БрГТУ – 2015. №6. – С. 3 – 11

14. Жаркоў, А.У., Варабей А.У., Астаповіч А.У. CASTRUM BRESTENSI / А.У. Жаркоў, А.У. Варабей, А.У. Астаповіч // Проблемы. Исследования. Тенденции развития региональной архитектуры. Сборник научных трудов. – 2017. – С. 24 – 31

15. Генеральные планы исторических центров городов. Гродно: пособие проектировщику/ Ю.Н.Кишик. – Минск: Минскпроект, 2007. – 282 с. : илл.222.

16. Города, местечки и замки Великого княжества Литовского : энциклопедия / ред. совет: Т.В.Белова (пред.) [и др.]. – 2 изд. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 312 с. : ил.

17. Довнар-Запольский, М. Берестейское староство в XVI в. // Унив. известия. – Киев, 1896, № 2. Ч.2. С. 1-33

18. Замок Берестейский. Книга первая. Русь / А.А.Гладыщук. – Гродно: ООО «ЮрСа-Принт», 2017. – 228 с.

19. Описание староства Берестейского 1566 г //Документы московского архива министерства юстиции, т.1. – Москва: «Товарищество типографии А.И.Мамонтова, 1897 г.

20. Чантурия, Ю.В. Белорусское градостроительное искусство: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм в системе европейского зодчества / Ю.В.Чантурия. – Минск : Беларуская навука, 2017. – 503 с. : ил.

21. Электронны рэсурс https://pl.wikipedia.org/wiki/Systemy_miar_stosowane_na_ziemiach_-polskich доступ 29.10.2017, 21.00.

22. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.5. М – Пуд / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.; Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; Маст. Э.Э.Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 1999. – 592 с.: іл.